НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

**№ 5 (117), КРАСАВІК 2011 ГОДА**

**http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна**

МЕРКАВАННЕ РЭДАКТАРА

# БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ

Апошнія рашэнні Міністэрства ўнутраных спраў сведчаць аб тым, што ў бліжэйшы час могуць пачацца суды над удзельнікамі падзеяў 19 снежня. Афіцыйнае заключэнне следства агучана, бадай што, самай экзатычнай у гісторыі незалежнай Беларусі страшылкай. Паводле версіі МУС, "атрыманыя вычарпальныя доказы аб спробе змены канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь па папярэдняй змове з прадстаўнікамі замежных дзяржаў і арганізацый, якія па сутнасці ставілі канчатковай мэтай ажыццяўленне дзяржаўнага перавароту". Следчыя дзеянні завершаныя толькі ў адносінах да арыштаваных і тых удзельнікаў падзеяў 19 снежня, што знаходзяцца на тэрыторыі краіны. На практыцы гэта азначае, что амаль усім былым кандыдатам ў прэзідэнты і яшчэ некалькім дзесяткам людзей пагражае да 15 гадоў турэмнага зняволення. Характэрна, што пазіцыя ўладаў адразу захісталася з боку ў бок пасля таго, як першыя штучна зшытыя следчымі справы пасыпаліся ў судзе. Напярэдадні былі асуджаны некалькі маладых хлопцаў. 17 лютага суд Фрунзенскага раёна Менску вынес першы прысуд па "справе 19 снежня". Палітычны актывіст Васіль Парфянкоў атрымаў чатыры гады пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў калоніі строгага рэжыму. Нягледзячы на адсутнасць доказаў і забылтаныя паказанні сведкаў з шэрагу міліцыянтаў, суддзя Вольга Камар палічыла хлопца вінаватым у крымінальным злачынстве па арт. 293 КК Беларусі (удзел у масавых беспарадках). А "віна" Васіля Парфянкова заключалася ў тым, што ён злёгку штурхнуў рукой у дзверы, што нават не цягне на дробнае хуліганства. Гэта было добра бачна на відэазапісе падзей 19 снежня. Тым не менш, яму яшчэ прысудзілі і буйны штраф памерам у 15 мільенаў рублёў за разбітыя вокны ў доме ураду. Надалей судовы канвеер пакараў маладафронтаўцаў Змітра Дашкевіча, які атрымаў два гады калоніі і Эдуарда Лобава – чатыры гады ўзмоцненага рэжыму. Гэтыя хлопцы на "Плошчы" наогул не былі. 18 снежня на іх напалі і збілі на вуліцы гэтак званыя "ціхушнікі", невядомыя правакатары, якія верагодна супрацоўнічаюць з міліцыяй і спецслужбамі. Суддзя Маскоўскага раёна Менска Алена Шылько перавярнула справу на карысць правакатараў, якія нібыта пацярпелі, а з пацярпелых зрабіла нападнікаў – адправіла ў турму ні ў чым не вінаватых людзей. Палітыка неправавых абвінаваўчых прысудаў паказала нашаму грамадству і ўсёй сусветнай супольнасці поўную нядзеяздольнасць і непрафесіяналізм лукашэнкавай наменклатуры. Кожны грамадзянін, нават самы недасведчаны ў юрыдычных навуках убачыў крывадушнасць чыноўнікаў прагнілай судовай сістэмы. Навошта рэжыму было гарадзіць байкі пра "масавыя беспарадкі" на плошчы ды страшылкі пра "дзяржаўныя перавароты"? Бязглуздыя абвінавачанні супраць мірных дэманстрантаў навідавоку. Вось толькі адна цытата з крымінальнага права: "Массовые беспорядки должны сопровождаться насилием над личностью, погромами, поджогами, уничтожением имущества, вооружённым сопротивлением представителям власти". Хіба на 19 снежня гарэлі аўтамабілі, банкі або магазіны, як у той жа Заходняй Еўропе? Такога ў нашай краіне быць не можа, менталітет не той. Славутая беларуская памяркоўнасць не дазволіць. Масавы гвалт над асобай хто ўчыніў? Тутака добра вызначыўся спецназ – увесь беларускі інтэрнет забіты ролікамі пра "подзвігі" амонаўскіх касталомаў, якія з асабліваю асалодай лупілі дубінамі маладых дзяўчат. Пры гэтым ніводзін работнік міліцыі на гвалт з боку дэманстрантаў у суд не паскардзіўся. Знішчэнне маёмасці – гэта трэба пашкодзіць яе да такога стану, пасля чаго яна не можа выкарыстоўвацца па прызначэнню. А вокны ў доме Ураду, якія выбілі невядомыя правакатары, былі ўстаўлены на наступны дзень. Дзякуй богу, міністрам выконваць дэкрэты кіраўніка дзяржавы гэта дробязная акалічнасць ніяк не замінае. І нарэшце самы сур'ёзны пункт абвінавачвання – "узброены супраціў". Ну і дзе зброя? Можа, хто небудзь з мітынгоўцаў адкрыў агонь з аўтаматаў, і на плошчы валяліся трупы забітых амонаўцаў? Трызненне, як кажуць з хворай галавы на здаровую. Адным словам, паводле беларускай юрыдычнай навукі, мірную акцыю нашых выбаршчыкаў, якія прыйшлі падтрымаць сваіх кандыдатаў 19 снежня ў Менску нельга трактаваць, як масавыя беспарадкі. Яшчэ больш цынічна выглядае спроба ўладаў абвінаваціць апазіцыянераў ў "дзяржаўным перавароце". Напалохаяны нечаканай актыўнасцю людзей, рэжым Лукашэнкі непрапарцыянальна ўжыў гвалт і катаванні супраць дэманстрантаў. Людзі атрымалі шматлікія траўмы, былі пераломаныя рукі, ногі, разбітыя галовы, выбітыя зубы. Выглядае, што сам Лукашэнка не упэўнены ў сваёй перамозе на выбарах – пераможцы так сябе не паводзяць. Ва ўсіх краінах свету кандыдаты, якія перамаглі супернікаў, выводзяць сваіх прыхільнікаў на вуліцы і святкуюць разам з імі. А тыя узурпатары, якія незаконна ўтрымліваюць уладу, нацкоўваюць на свой народ казённых наймітаў у чорнай форме з дубінамі. Той, хто чапляецца за ўладу, ідзе на ўсё, каб яе утрымаць, запалохвае народ рэпрэсіямі ды пры гэтым лічыць сябе "бацькам". Колькі б там галасоў не набралі кандыдаты ў прэзідэнты, людзі маюць права публічнага голаса на мітынгах. І таптаць народ нікому не дазволена.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## Зямныя каралі

*Набудавалі храмаў на зямлі,
Забыліся паставіць храмы ў душах.
І вольны дух людскі нахабна душаць
Пад гул званоў зямныя каралі.*

*Жалеза не шкадуюць для крыжоў,
Для купалоў – сусальнай пазалоты.
Да Бога сталі моднымі залёты
З уладаю заручаных мужоў.*

*Для імі ж панявечаных капліц
Яны гатовы траляваць бярвенне,
Каб Божае святое блаславенне
Багатымі дарункамі купіць.*

*Карціць ім змыць ахвяр нявінных
кроў,
Бо вера ў моц правадыроў аслабла.
І вось яны, былыя служкі д'ябла,
Цалуюць сёння рукі святароў.*

*Яны гатовы ўжо спраўляць пасты
І прагнуць дачакацца ласкі Божай.
І іх зусім, напэўна, не трывожыць,
Што ў свеце поўна алтароў
прыгожых
І мноства душ няшчырых і пустых...*

**Г.Бураўкін.**

## "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчацца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# ЯК ПАВЫСІЦЬ ДАХОДНАСЦЬ АГРАЭКАСЯДЗІБАЎ?

***За апошнія два гады як па краіне, так і ўнашым раёне пачаўся сапраўдны бум вясковага турызму***

Паводле афіцыйных звестак, Віцебская вобласць утрымлівае пальму першынства ў Беларусі па колькасці сельскіх агарэкасядзібаў.Усяго ў нашай вобласці працуюць 320 суб'ектаў аграэкатурызму. Невялікая іх колькасць зарэгістравана і ў нашым раёне. Шумілінцы – людзі гасцінныя. Першымі "першапраходцамі" новага віда паслуг стала Лідзія Пацябенька, якая адкрыла аграэкасядзібу "Прыдзвінскі край", Надзя і Аляксандр Ісаковічы – гэта сям'я стала гаспадарамі сядзімы "Бацькоўскі кут", што ў Язвіне. Трэба сказаць, што нашы гаспадары набылі вопыт па абслугоўванню замежных гасцей з Галандыі, Германіі і Швецыі. Аднак асноўная маса адпачываючых – расіяне, турысты з Балтыі і жыхары Беларусі. Добрым стымулам для росту стала праграма Белаграпрамбанка па крэдытаванню вясковага турызму. Сядзібы вобласці атрымалі на развіццё сваёй справы 22 мільярды рублёў. Апроч таго, гаспадароў сельскіх сядзіб амаль што вызвалілі ад падаткаў. Заплаці адну базавую велічыню ў год – і працуй. Эканамічны разлік быў просты: чым траціць бюджэтныя сродкі на стварэнне новых рабочых месцаў у сельскай мясцовасці, больш выгадна даць людзям свабоду, каб яны самі "раскруціліся". І ўсё ж нельга сказаць, што гэты від дзейнасці ў раёне набыў вялікую папулярнасць і размах. Па розных прычынах у нашым раёне яшчэ занадта мала гаспадароў, якія рызыкнулі займацца аграэкатурызмам. Аднак рэсурсны патэнцыял заўсёды ёсць. Да прыкладу, вынікі сацыялагічнага апытання паказваюць, што больш паловы сельскіх жыхароў выказалі жаданне займацца прадпрымальніцтвам. Теарэтычна шумілінцы дэманструюць высокую делавую актыўнасць. У якасці пажаданых заняткаў жыхары раёна назвалі рознічны гандаль, перавозкі, будаўнічыя і рамонтныя работы, жывёлагадоўлю, касметычныя паслугі. Больш таго, чыноўнікі не замінаюць развіццю тых відаў гаспадарчай дзейнасці, якія будуць прыцягваць у раён грашовыя сродкі інвестараў. У прыватнасці, рэкамендуюць наладзіць прыдарожны сервіс або вытворчасць прадукцыі на базе мясцовых мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Але эксперты ўдакладняюць, што значную ролю ў развіцці вясковага турызму адыгравае знешні фактар. Нашы сядзібы прайграюць канкурэнцыю з тымі ж польскімі і літоўскімі, куды, напрыклад немцам, віза не патрэбная. Ды і суадносіны цаны і ўзроўню сервісу там нярэдка больш прываблівыя, чым у нашым рэгіёне. Разам з тым паўстала праблема больш якаснага абслугоўвання турыстаў. Усё больш складана атрымаць дазвол на афіцыйную дзейнасць сядзібы ў цэнтры гігіены і эпідэміялогіі. Санітарныя ўмовы гасцявых дамоў павінны адпавядаць умовам гатэля. Каб павысіць даходнасць аграсядзіб, трэба каб яны працавалі не асобна, а ў звязку з іншымі турыстычнымі і санаторнымі аб'ектамі. Той жа дзіцячы летнік, што ў Амбросавічах, пустуе аж цэлых дзевяць месяцаў. А пакуль што трэба думаць, чым прывабіць гасцей. Прынамсі, Шумілінншчына славіцца не толькі хараством мясцовых пейзажаў. Калі гаспадары будуць самі больш клапаціцца аб сваіхвытоках,культуры,гісторыі роднага краю, тады адчыняцца новыя магчымасці. Звычайныя вясковыя аграсядзібы стануць носьбітамі і захавальнікамі нацыянальнай спадчыны.

**С. Горкі.**

## АБ'ЯВА

***• Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***

***• Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвес-ткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***

***• Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатныхюрыстаў.Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***

***• Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

## ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ

# І за прыгожым фасадам можна адчуваць дыскамфорт

Той, хто сыходзіць з цягніка на чыгуначнай станцыі ў Шуміліне, адразу заўважае прыгожы будынак вакзала. Наш чыгуначны вакзал – гістарычны помнік XIX стагоддзя, які добра захаваўся і даглядаецца належным чынам. А побач з будынкам вакзала размешчаны менш важны, але жыццёва неабходны аб'ект, у які заходзяць па патрэбе і жыхары райцэнтра, і госці. Гэта – грамадская прыбіральня. Невялікая цагляная пабудова звонку выглядае выглядае больш- менш прыстойна: сцены атынкаваны і пабелены. Аднак знутры, мякка кажучы, кліент адчувае сябе не зусім камфортна. Калі нехта спадзяецца там убачыць выкладзеныя бліскучай пліткай сцены, утульныя кабіны з дзвярыма бялюткага колеру і сучасным ватэрклазетам, то хутка пераканаецца, што гэта зусім не так. Усе зручнасці яшчэ "класічныя", змайстраваныя па дзедаўскай тэхналогіі. Грамадзянам "пад градусам" туды лепш не заходзіць, каб часам не надарыўся няшчасны выпадак. У прыватных гутарках шумілінцы выказваюць незадаволенасць, маўляў, улады змагаюцца за наданне райцэнтру статуса горада, а пытанне недахопу цывілізаваных туалетаў вырашыць не могуць. Згодна з дзяржаўнымі сацыяльнымі стандартамі патрэбна 1 прыбіральня на тысячу жыхароў. У сямітысячным горпасёлку Шуміліна рэальна дзейнічае толькі дзве: старая на чыгуначным вакзале і новая на аўтавакзале. У іншых людных месцах, напрыклад на рынку, можна трапіць у няёмкую сітуацыю. Наогул, ці то гэта ад нашай бяскультурнасці, ці то ад беднасці, але праектаванне і будаўніцтва гандлёвых, сацыяльных і адміністрацыйных аб'ектаў не вялося з улікам магчымасці размяшчэння ў іх прыбіральняў грамадскага карыстання. Шмат у якіх райцэнтрах ёсць платныя туалеты, якія папаўняюць гарадскую казну, а грошы, як вядома не пахнуць. А шумілінцам пакуль што даводзіцца спадзявацца, што з цягам часу ўзровень нашых даходаў і культуры будуць расці.

**Я. Вайтовіч.**

# ДАРОГУ РОВАРУ!

З надыходам цёплага сезону на вуліцах Шуміліна з'явіліся веласіпедысты. Іх не так шмат, як дзе-небудзь у гарадках Даніі, ды і нашы веласіпеды ні ў лепшы бок адрозніваюцца ад еўрапейскіх мадэляў. Аднак, што маем – на тым і ездзім. Тым больш, што веласіпед на Шумілініпчыне заўжды быў папулярным відам транспарту, які не патрабуе асаблівых расходаў. Шумілінцы едуць на веласіпедах на работу, у краму, аптэку, адпаведна павялічылася колькасць і такіх, якія імкнуцца да здаровага ладу жыцця. Але ці прыстасаваны наш райцэнтр для тых, хто выбірае гэты сродак перамяшчэння? Ці ёсць наогул у горпасёлку такое паняцце, як веладарожка? Нагадаем, што веласіпедная дарожка – частка дарогі, прызначаная для руху веласіпедаў, вылучаная дарожнай разметкай і абазначаная адпаведнымі дарожнымі знакамі. Веладарожка канструкцыйна афармляецца ў выглядзе адасобленай паласы. Веладарожкамі таксама лічацца палосы для велаpуху, якія мяжуюць з пешаходнымі дарожкамі, або знаходзяцца на праезжай частцы дарогі. На жаль, для шумілінцаў ровар з'яўляецца даволі небяспечным транспартам ва ўсіх адносінах. На праезжай частцы дарогі пануюць аўтамабілі, пешаходы карыстаюца тратуарам і пешаходнымі дарожкамі. А веласіпедыст адчувае сябе няўпэўнена і рызыкуе больш за ўсіх удзельнікаў руху – адмысловыя веладарожакі ў пасёлках раёна адсутнічаюць. Нярэдкі і выпадкі, калі з удзелам веласіпедыстаў адбываюцца дарожныя здарэнні. Пры гэтым любое сутыкненне з веласіпедам небяспечна, калі ўлічыць, якую хуткасць можа развіць веласіпед. А яна нежартоўная, можа саставіць ад 18 да 35 кіламетраў у гадзіну. Прычым тармазны шлях пры аднолькавых хуткасцях нават большы, чым у аўтамабіля, асабліва па мокрай дарозе. Да таго ж аўтааматары не вельмі сур'ёзна ставяцца да веласіпедыстаў. Калі на Захадзе іх усюды прапускаюць, дык у нас наадварот, імкнуцца "падрэзаць". З іншага боку, юныя веласіпедысты паводзяць сябе так адчайна, быццам бы правілы дарожнага руху для іх зусім не існуюць. Падлеткі ганяюць на роварах і па тратуарах, і па пешаходных дарожках. Як бы там ні было, але наспела неабходнасць стварыць бяспечныя ўмовы для ўсіх відаў транспарту. Відавочна, што гэта справа зрушыцца зверху, з абласнога цэнтра. Надоечы першыні прагучалі заявы з вуснаў віцебскіх чыноўнікаў. Сяргей Маторанак, начальнік упраўлення ДАІ Віцебскага аблвыканкама выказаў сваю прапанову аб неабходнасці адмысловых веласіпедных дарожак. У бліжэйшы час ён будзе настойліва патрабаваць ад усіх органаў кіравання вырашэння гэтай праблемы. Мабыць неўзабаве заварушацца і нашы шумілінскія чыноўнікі. Праўда, велапаркоўка каля некаторых магазінаў ужо ёсць. У гэтай справе нічога выдумляць не трэба, існуе напрацаваны вопыт еўрапейскіх краін. Еўрапейскія правілы і логіка, з якіх вынікае, што спачатку ідзе аўтадарога, затым веладарожка, потым пешаходная – цалкам прымальныя і для нашых суайчыннікаў.

**Алесь Прыбярэжны.**

# А на работу – па блату

Лепшае працоўнае месца можна атрымаць толькі дзякуючы сувязям у органах улады. Так лічыць, бадай што, пераважная большасць жыхароў нашага раёна. Паводле сацыялагічнага апытання, якое праводзілася на сайце дзяржаўнага раённага выдання "Герой працы", шумілінцы не вераць, што добрай працы з высокай аплатай можна дабіцца сумленным шляхам, разлічваючы толькі на собскія сілы. На пытанне:"Што патрэбна, каб атрымаць добрую працу з высокай заработнай платай?" 60% рэспандэнтаў адказалі – патрэбныя знаёмствы, (блат). 20% лічаць неабходным прэстыжную адукацыю, яшчэ 10% спадзяюцца на вялікі працоўны стаж і вопыт. Вера ў сувязі, спадзяванне на сваякоў, "прыбліжаных" да аддзела кадраў нярэдка прымушае нашых землякоў трапляць у залежнасць ад начальства, шукаць розныя лазейкі для таго, каб уладкавацца на утульную пасаду. Ды і само слова блат раней існавала побач з пратэкцыяй, але тычылася яно справаў цёмных, зладзейскіх і рабунковых,а таму было распаўсюджана толькі ў крымінальным жаргоне. Блат ва ўмовах савецкай камандна-адміністрацыйнай сістэмы ( якая захавалася і дагэтуль ) быў, так бы мовіць, звязкай сацыяльнага механізму. Атрымаць начальніцкую пасаду дзенебудзь на прадуктовай базе ў савецкі час можна было толькі паводле пратэкцыі, іншую працу па спецыяльнасці ў той жа арганізацыі – па знаёмстве. Блат непарыўна звязаны са словамі "дастаць" і "дэфіцыт". Многія падумаюць – а які зараз дэфіцыт, усё ж можна купіць, былі б толькі грошы? Цяперашні дэфіцыт, які так старанна хавае ўлада – гэта вострый недахоп у раёне рабочых месцаў. Бывае так, што пасаду і за грошы не купіш. Паспрабуйце, напрыклад уладкавацца простым вартаўніком у дзяржаўную ўстанову – без знаёмства не возьмуць. Вось што распавёў мне знаёмы выпускнік аднаго з універсітэтаў: "Няўжо вы думаеце, што нашу эканоміку кантралююць разумныя людзі? Можа яны адукаваныя, маюць густ, добра бачаць мэты і сэнс сваёй працы і жыцця? Не сябры, вы памыляецеся, гэта міф. Яны (чыноўнікі ) самі выдумляюць гэты міф, многія з іх у свой час скончылі ВНУ таксама па блату, так жа былі прыняты на пасаду, увайшлі ў свет кумаўства, уласных сувязяў ды ўзаемнага кампрамату. І потым грызліся між сабой за права шчыльней сядзець да "вертыкалі", лізалі языкамі зады непасрэднага і абсалютнага кіраўніцтва, і тым зарабілі ўладу. А неабмежаваная ўлада зараз ой як многа дае! Калі народ зразумее, што яны не адукаваныя, а проста хітрыя і нахабныя ( ды ім ёсць альтэрнатыва), міфу канец. Ім прыйдзецца шукаць новую працу без персанальных аўто, рабоў-падначаленых ды барзых халуёў".Супраць гэтага меркавання цяжка што-небудзь запярэчыць. Дарэчы, гэтыя малады спецыяліст надоўга затрымаўся ў нашым раёне. Нават не адпрацаваў вызначаны тэрмін пасля заканчэння ВНУ і з'ехаў за мяжу.

**Алесь Шумскі.**

## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

# ВАЛЮТНАЯ ЛІХАМАНКА

Не сакрэт, што ў абменых пунктах райцэнтра Шуміліна немагчыма набыць валюту. Валюта ў Шумілінскім філіяле "Беларусбанка" адсутнічае ўжо ў першыя гадзіны працы. На днях вырашыў паспытаць шчасця ў набыцці даляраў – двойчы звяртаўся ў абменнік. Курс такі: даляр – купля 3080 беларускіх рублёў, продаж – 3111. Чаргі каля абменніка не было. На маё пытанне: "Ці ёсць даляры?" касірка дала адмоўны адказ. Еўра таксама няма, а калі будзе – невядома. Бавае толькі тады, калі нехта здае, прадаюць, як кажуць " з колаў". Але ў апошні час шумілінцы больш скупляюць, чым здаюць. Да гутаркі далучаюцца дзве спадарыні. Яны паведамляюць, што таксама на працягу трох тыдняў у абменніках райцэнтра не змаглі купіць даляры ЗША. Жанчыны прызналіся, што амерыканскай валюты ім патрэбна няшмат, у сувязі з чуткамі пра дэвальвацыю беларускага рубля. Разам з павышэннм попытам на валюту назіраецца і другая тэндэнцыя. Кліенты мясцовых банкаў здымаюць беларускія грошы. Хутчэй за ўсё, гэтыя грошы ўкладаюць у тавары. Чым выклікаць ажыятаж на валютным рынку? Старшыня Нацыянальнага банку Пятро Пракаповіч, які супакойваў народ перад "выбарамі" байкамі пра ўмацаванне нацыянальнай валюты, раптоўна некуды знік. Па неафіцыйных звестках, галоўны банкір трапіў у шпіталь. Замест яго тлумачэнні даваў начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанку Анатоль Драздоў. Чыноўнік запэўніў, што людзі робяць глупства, калі скупляюць і назапашваюць валюту і тавары. Ён прадказаў, што фінансавага крызісу няма, а людзі неўзабаве зноў панясуць валюту ў банкі. У сваю чаргу былы кіраўнік Нацбанку Станіслаў Багданкевіч пракаментаваў сітуацыю на валютным рынку: "Дэфіцыт гандлёвага балансу адмоўны. Гэта азначае, што мы набываем больш, чым прадаём, і не маем дастаткова выручкі, валюты. У гэтых умовах адбываецца абясцэньванне нацыянальнай валюты". Зрэшты, аб'ём золатавалютных рэзерваў Беларусі на 1 красавіка 2011 года склаў 3 мільярда 761 мільёна доларaў супраць 5 мільярдаў 30,7 мільёна доларaў на пачатак года. Як прызнаюць у Нацыянальным банку, асноўнай прычынай зніжэння аб'ёму золатавалютных рэзерваў у сакавіку стаў высокі попыт на замежную валюту з боку насельніцтва. А калі падае давер насельніцтва да беларускага рубля, то гэта азначае, што і крэдыт даверу да кіраўніцтва краіны таксама вычарпаны.

**Алесь Шумскі.**

## КРЫМІНАЛ

# БЕСПРАЦОЎНЫ АБРАБАВАЎ ПЕНСІЯНЕРА

5 красавіка ў Шумілінскі РАУС звярнуўся пенсіянер 1949 года нараджэння, жыхар гарадскога пасёлка Обаль. Каля дома па вуліцы Леніна яго абрабаваў невядомы злодзей, які выцягнуў з кармана пінжака 240 тысяч беларускіх рублёў. Як высветлілася, злачынства ўчыніў мясцовы жыхар 1981 года нараджэння, непрацуючы. Заведзена крымінальная справа па артыкуле 205 ч. 1 КК.

# КРАДЗЁЖ З УЗЛОМАМ У ДОМЕ ПЕНСІЯНЕРКІ

Уміліцыю паступіў званок ад жыхаркі райцэнтра, якая паведаміла, што ў хаце ўзламаны ўваходныя дзверы. Невядомыя зламыснікі скралі бульбу і іншыя прадукты харчавання. Неўзабаве злодзеяў затрымалі. Імі аказаліся непрацуючы мужчына і яго сужыцелька, абое – мясцовыя жыхары. Супраць іх узбуджана крымінальная справа.

## ДЭМАКРАТЫЧНЫ РУХ

# СЯРГЕЯ КАВАЛЕНКУ НЕЧАКАНА АДПУСЬЦІЛІ З-ПАД АРЫШТУ



**Віцебскі апазыцыянэр паведаміў, што яго адпусьцілі з ізалятара часовага ўтрыманьня, дзе ён мусіў дабыць 12 сутак арышту. Сам ён мяркуе, што да гэтага прычыніліся ягоная галадоўка і шэраг скаргаў у пракуратуру.**

8 красавіка міліцэйскі канвой даставіў актывіста ў ізалятар часовага ўтрыманьня пасьля выпіскі са шпіталя, дзе Каваленка лекаваўся ў кардыялягічным аддзяленьні.

"Літаральна на ганку ў кагосьці зь міліцыянтаў зазваніў мабільны тэлефон, і пасьля непрацяглай размовы мне заявілі, што я вольны да таго часу, пакуль будуць разабраныя мае скаргі ў пракуратуру. Я мяркую, паўплывалі яшчэ і мае галадоўкі пратэсту, абвешчаныя пасьлядоўна 25 сакавіка і 1 красавіка", — паведаміў "Свабодзе" віцебскі актывіст КХП БНФ.

Пакуль Сяргей Каваленка галадоўку спыняе. Але не выключае, што зноў абвесьціць яе ў тым выпадку, калі яму ўсё ж прыйдзецца даседжваць апошні арышт.

Спадар Каваленка адгаладаваў больш за 10 сутак, пратэстуючы супраць несправядлівых, на ягоную думку, затрыманьняў і арыштаў. Першы арышт ён адбыў з 25-га сакавіка па 1 красавіка — актывіста пакаралі за тое, што выйшаў у цэнтар Віцебску з трыма бел-чырвона-белымі сьцягамі. Усе гэтыя сем дзён ён адгаладаваў, а потым абвясьціў і наступную галадоўку — калі яго затрымалі на выхадзе з ІЧУ і далі яшчэ 15 сутак арышту.

Крымінальна-выканаўчая інспэкцыя зноў накіравала Сяргея Каваленку ў ізалятар часовага ўтрыманьня за парушэньне рэжыму: актывіст адбывае так званую "хатнюю хімію" — тры гады абмежаваньня волі "ўмоўна" — пасьля вывешваньня бел-чырвона-белага сьцяга на навагодняй ёлцы. Парушэньнем была прызнана акцыя са сьцягамі напярэдадні Дня Волі, але Каваленка дагэтуль ня выдалі пастанову на апошні арышт. Падчас гэтага апошняга арышту ён трапіў у шпіталь, бо далі сябе знаць наступствы шматдзённага галадаваньня.

Актывіст напісаў у пракуратуру некалькі скаргаў з прычыны беспадстаўнага, як ён лічыць, зьняволеньня. Скаргу на імя пракурора Віцебскай вобласьці з патрабаваньнем спыніць перасьлед Сяргея Каваленкі напісаў і віцебскі апазыцыянэр Барыс Хамайда.

Паводле вынікаў разбору будзе прынята рашэньне, ці законным было апошняе затрыманьне і ці вернецца Сяргей Каваленка ў ізалятар часовага ўтрыманьня.

**Радыё Свабода.**

ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# Пляска на костях

ТЕРАКТ РАСКРЫТ, ВИНОВНЫЕ НАЙДЕНЫ И УЖЕ ВО ВСЕМ СОЗНАЛИСЬ. ТОЧКА В ДЕЛЕ ПОСТАВЛЕНА. ИЛИ ЭТО ТОЛЬКО НАЧАЛО БОЛЬШОЙ ЗАЧИСТКИ? ОБВИНЯЯ ОППОЗИЦИЮ В «ПЛЯСКЕ НА КОСТЯХ», ВЛАСТИ ПРИ ЭТОМ БЕЗ ЗАЗРЕНИЯ СОВЕСТИ РЕШАЮТ НАСУЩНЫЕ ЭКОНОМИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ. ВЕРНЕЕ, НЕ РЕШАЮТ, А ЗАСТАВЛЯЮТ ЗАМОЛЧАТЬ ТЕХ, КТО РИСКУЕТ ОБ ЭТИХ ПРОБЛЕМАХ НАПОМНИТЬ.

В среду Александр Лукашенко, заслушивая доклад о ходе расследования теракта, констатировал: «преступление раскрыто». По его словам, «чекистам и милиции понадобились сутки, чтобы провести блестящую операцию и без шума и трескотни задержать исполнителей».

— Главное — мы знаем, кто и как совершил этот теракт. Пока не известно зачем. Но и это станет известно, — заявил Лукашенко.

Действительно, очень хочется верить, что общественности скоро продемонстрируют все неоспоримые доказательства вины подозреваемых, и они получат по заслугам. Увы, полностью дискредитировавшая себя судебно-правовая система в нашей стране до последнего заставляет сомневаться в том, что получат по заслугам именно те и именно за то. Уж очень много «дохлых крыс» нам подкинули «доблестные» органы сыска.

Теперь, когда чекисты «без шума и трескотни» за сутки отыскали виновных, вопросов появиться еще больше. Уже известно, что «задержанные признались во взрывах в День независимости в 2008 году в Минске и ранее в Витебске». Как, в общем, и известно, что, попадая в руки наших спецслужб, любой может признаться там хоть в убийстве Кеннеди. К тому же известно, что в 2005 году уже находили «двух охламонов» (так их назвал президент), которые тоже успели тогда во всем признаться.

Никто не говорит, что сейчас задержаны невиновные люди (для этого мы не располагаем соответствующими фактами), но многие независимые эксперты предостерегают: как бы — в рвении отрапортовать любой ценой — виновных в трагедии не «назначили».

Главным остается еще один вопрос: кому и зачем это надо? Свою лепту в расследование внес и Александр Лукашенко, поручив допросить «отдельных оппозиционных политиков» (судя по всему из тех, кому посчастливилось после 19 декабря остаться на свободе).

— Необходимо расследовать все заявления деятелей от политики, которые обвиняли кого не лень. Сегодня мы ищем соучастников и заказчиков. Может, эти деятели от "пятой колонны" раскроют карты и укажут, кто заказал, — потребовал президент и подчеркнул: — Всех допросить, несмотря ни на какие вопли и стоны зарубежных страдальцев. Материалы есть.

Что это за «материалы» глава государства, естественно, не уточнил. Но можно не сомневаться, что при необходимости они обязательно «найдутся».

Кстати, комментируя на «Эхо Москвы» произошедшее в Минске, Антон Орехъ отмечал: «Об истинных причинах мы сможем судить косвенно по дальнейшему развитию событий. Если, например, Лукашенко использует теракт для дальнейшего разгрома оппозиции, ликвидации даже формальных свобод – то вот вам, пожалуйста, готовая версия, что взрыв был выгоден только Лукашенко».

Оставим, пожалуй, это утверждение без комментариев. Тем более что сейчас за любые "измышления" на эту тему виновные будут нести уголовную ответственность. Об этом сегодня также недвусмысленно дал понять президент. Причем, говоря о теракте, хватил куда шире.

— Любая паника, в том числе по поводу продовольствия, валюты, должна пресекаться. За распространение клеветнических измышлений виновные понесут уголовную ответственность.

Господи, неужели подсолнечное масло, пустые обменники и теракт в метро – звенья одной цепи? И кто после этого спекулирует на человеческом горе? Обвиняя оппозицию в "пляске на костях", власти при этом без зазрения совести решают насущные экономические проблемы. Вернее, не решают, а заставляют замолчать тех, кто рискует об этих проблемах напомнить.

Но от того, что газеты перестанут писать про пустые обменники, валюта в стране не появится, а трагедия, унесшая жизни 12 человек и покалечившая сотни судеб, меньшей не станет. Впереди будет еще много возможностей распрaвиться с инакомыслящими и заткнуть экономические дыры пропагандистской риторикой. Сейчас время для популизма выбрано не самое удачное.

**Павел Дмитриев.**

НАШ КІРАЎНІК

## ЗАЧЕМ ЛУКАШЕНКО ВЗЯЛ РЕБЕНКА НА МЕСТО ТЕРАКТА?

Сообщение президентской пресс-службы обескураживает. Вот цитата из текста, появившегося на официальном сайте главы Беларуси: «Глава государства немедленно прибыл на станцию метро «Октябрьская», спустился вниз на платформу и вместе с сыном возложил живые цветы к месту взрыва. Это были первые цветы в память жертв теракта».

Сходу возникает вопрос: в сложившейся ситуации обязательно было уточнять, что цветы от Александра Лукашенко были первыми возложенными в память жертв теракта? Или у нас иначе нельзя: глава государства должен быть №1 всегда и во всем: на хоккейной площадке, «Минской лыжне» и с цветами на месте теракта???

Но еще большее недоумение вызывает явление Лукашенко на «Октябрьскую» с младшим сыном Колей. Еще раз вчитаемся в сообщение президентской пресс-службы: «…вместе с сыном возложил живые цветы к месту взрыва… Президент попросил увести Николая наверх, чтобы ребенок не увидел ужасную картину трагедии».

Во-первых, если цветы возлагали к месту взрыва, то «ужасную картину трагедии» мальчик уже видел. Во-вторых, зачем вообще было брать ребенка на место теракта??? Лукашенко полагал, что там будет что-то подходящее для детских глаз?

Всё это оставляет очень неприятное послевкусие. Время и место для пиаровских «выходов в свет» с сыном надо бы выбирать аккуратнее.

**Вадим Ливнев.**

ДЭМАКРАТЫЧНЫ РУХ

## МІЛІНКЕВІЧ ПРА НАСТУПСТВЫ ТЭРАКТУ Ў МІНСКУ

«Гэта тэракт не проста каб запалохаць, каб нешта развaліць, гэты тэракт прадугледжвае пэўны ланцужок дзеянняў. Пасля такога тэракту ўлады, напэўна, прымуць жорсткія меры, магчыма, і далейшыя рэпрэсіі супраць дэмакратычнай супольнасці», – мяркуе Аляксандр Мілінкевіч.

Аляксандр Лукашэнка заявіў учора, што ведае злачынцаў. Ці быў гэта намёк на прадстаўнікоў апазіцыі?

«Я не думаю, што адзінаю мэтаю такога тэракту быў чарговы віток рэпрэсіяў. Тут размова ідзе пра геапалітычны выбар Беларусі. Я не выключаю замежнага следу, таму што сапраўды Беларусь мусіць зрабіць цывілізацыйны выбар, і такія тэракты могуць моцна паўплываць на тое, што з намі будзе праз год, праз дзесяць. Толькі следства адкажа на гэтыя пытанні. Сёння я ведаю адно – гэта вялізарная трагедыя для беларускага народу і сёння сапраўды мы ў шоку», – сказаў Аляксандр Мілінкевіч у інтэрв'ю «Белсату».

НАША ЎЛАДА

## ЛУКАШЭНКА ПРА БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ СЯБЕ: «ЛЮДЗІ ПАМІРАЦЬ БУДУЦЬ НА ВУЛІЦЫ»

**Салідарнасць**

У расійскай газеце «Завтра» апублікаваная трэцяя частка стэнаграмы з сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з рэдактарамі расійскіх СМІ, якая адбылася 18 сакавіка. У інтэрв'ю, акрамя іншага, кіраўнік дзяржавы дэ-факта прызнаў, што разглядае нашу краіну, як асабістую ўласнасць.

Галоўны рэдактар гэтага выдання Аляксандр Праханаў апублікаваў новыя старыя заявы Лукашэнкі, якія да гэтага часу не фігуравалі ў СМІ.

— Наша адзінства і наша сяброўства — святое, нікому не дазволена гэта разбурыць. І калі хто-то паспрабуе, будзе дрэнна. У нас паспрабавалі некаторыя, але народ іх смел, абрaўшы пацана першым прэзідэнтам. Я што, заслугоўваў гэта? Не, — агучвы Лукашэнка, са спасылкай на «Зaўтра» паведамляюць naviny.by.

Сыходзіць з пасады кіраўніка дзяржавы Аляксандр Лукашэнка не хоча нават праз 17 гадоў: " Ёсць тыя, якія разважаюць так: хопіць. Гэта няправільнае разважанне з майго пункту гледжання — хопіць ці не хопіць. Што значыць «хопіць»? Я — не пенсіянер, нават калі і пенсіянер, я здаровы, ну чаму не працаваць? Усе лічаць, што прэзідэнт — гэта як цар. Але гэта не цар. Гэта чалавек, які павінен наперадзе ўсіх бегчы і шмат рабіць у Беларусі. Разважаюць «ну хопіць», тыя, якія думаюць, што пабыў ва ўладзе, атрымаў сваё, няхай цяпер іншыя атрымаюць. Гэта няправільныя і шкодныя развагі."

"У мяне, акрамя краіны, нічога няма," — настойвае ён.

Больш таго, будучыня Беларусі без Лукашэнкі яму ўяўляецца апакаліптычным: "Таксама думаю: вось сыдзеш, прыватызуюць усе: ахова здароўя, медыцыну… Людзі паміраць будуць на вуліцы."

Ну і на закуску Аляксандр Лукашэнка дэ-факта прызнаў, што разглядае нашу краіну, як асабістую ўласнасць. — Папракаюць: Лукашэнка прыватызуе Беларусь… Але гэта мая Беларусь.

СВЕТ ПРА БЕЛАРУСЬ

The Economist

## ТЭРАРЫЗМ ПРЫХОДЗІЦЬ У МЕНСК

**Радыё Свабода**

**Брытанскі часопіс The Economist прапануе свой аналіз абставінаў, прычынаў і магчымых наступстваў тэрарыстычнага акту ў Менску 11 красавіка.**

Чалавечыя страты навідавоку, хаця прычына зьяўляецца незразумелай.

Палітычны гвалт у Беларусі – справа рэдкая, хаця і не невядомая. Дзесяць гадоў таму чатыры чалавекі прапалі бязь вестак. Лічыцца, што яны былі забітыя ўладамі. З таго часу дэманстрацыі апазыцыі рэгулярна груба здушваліся, але найгоршае, што адбывалася, гэта зламаныя косьці, а не трупы. У выніку таямнічага выбуху ў 2008 годзе дзясяткі людзей былі параненыя. Ніхто ня ўзяў на сябе адказнасьці.

У іншых краінах цень падазрэньня ў такіх выпадках адразу падае на ісламістаў. Але тут іх дачыненьне малаімавернае. Беларусь засталася ўбаку ад вайны Расеі ў Чачні, таму не выклікае гневу джыгадыстаў. Яна ня мае значнай колькасьці мусульманскага жыхарства. Да таго ж тэрарысты з Паўночнага Каўказу, як правіла, тэрарысты-сьмяротнікі.

Цяжка меркаваць, што за гэтым можа стаяць апазыцыя. Гэта не дэстабілізуе рэжым і нясе велізарную рызыку для злачынцаў. І гэта зусім не адпавядае характару беларускай апазыцыі. Беларускіяапазыцыянэрымаюцьшматнедахопаў: яны занадта любяць выступаць на канфэрэнцыях на Захадзе, яны занадта неактыўныя, калі гаворка ідзе аб правядзеньні палітычных кампаніяў дома. Але самае горшае, што можна сказаць пра іх, – гэта тое, што яны маюць маргінальны, але зусім не забойчы характар.

Больш імаверным кандыдатам зьяўляюцца экстрэмісцкія рухі. Беларусь ня мае рэальнай традыцыі палітычнага радыкалізму. У Расеі ёсьць скінгэды і нават нэанацысты. Такія групы маюць нязначныя адгаліненьні ў Беларусі. Магчыма, адна зь іх вырашыла прадэманстраваць свае здольнасьці.

Расколы ўнутры рэжыму – гэта таксама магчымая вэрсія. Арышт у сьнежні 2010 году кіраўніка вайскова-паветраных сілаў Ігара Азаронка застаецца таямніцай і, можа быць, абурыў яго сяброў. Некаторыя аналітыкі гавораць пра існаваньне канкурэнцыйных фракцыяў маладых і старых "ваўкоў" (сяброў прэзыдэнтавага сына Віктара Лукашэнкі, з аднаго боку, і старых кадраў КДБ, з другога).

Іншы аналіз гаворыць, што тэракт зладзіла фракцыя ва ўладзе, якая хоча падштурхнуць Беларусь да большага закручваньня гаек і аддаленьня ад Захаду.

Такімі таемнымі ўнутранымі махінацыямі, вядома, можна растлумачыць амаль усё. Але было б нядрэнна мець некаторыя доказы. А зь імі складана. Пасьля выбуху 2008 году быў адпраўлены ў адстаўку ўплывовы каардынатар службаў бясьпекі Віктар Шэйман. Але існуе меркаваньне, што Лукашэнка звольніў Шэйманa ў любым выпадку. І дзіўнай здаецца гіпотэза, што ўлада будзе кідаць бомбы, каб апраўдаць кадравыя перастаноўкі.

Цяпер выказваецца думка, што выбух павінен быў адвесьці ўвагу грамадзтва ад эканамічных праблемаў краіны.

Апазыцыя асьцерагаецца, што выбух будуць выкарыстоўваць у якасьці падставы для яе ўціску. І гэта ў прынцыпе магчыма. Выбух 2008 году стаў падставаю для кампаніі масавага зьняцьця адбіткаў пальцаў. Але ўлады і бяз гэтага распраўляюцца з апазыцыяй, і незразумела, якой дадатковай падставай зьяўляецца выбух. У 1999 годзе выбухі дамоў у Маскве і іншых гарадох Расеі спарадзілі паніку, наступствам якой – выпадкова ці не – стала тое, што новы прэм'ер-міністар Уладзімер Пуцін нечакана стаў самым папулярным палітыкам у краіне. Але спадар Лукашэнка ўжо папулярны.

У выніку застаецца лябірынт люстэркаў. Ці гэта зрабілі ўлады, каб дыскрэдытаваць апазыцыю? Ці апазыцыя зрабіла гэта ў надзеі, што віна будзе ўскладзеная на ўлады? Ці гэта расейцы, універсальныя ліхадзеі для некаторых тэарэтыкаў змовы? Ці рэжым зрабіў гэта, каб падкрэсьліць пагрозу ад «экстрэмістаў» або каб ускласьці віну на замежнікаў? Ці гэта НАТО: урэшце, калі Захад бамбуе Лібію, дык чаму б не Беларусь? Тлумачэньні робяцца ўсё больш абсурдным і непраканаўчымі.

Факт тое, што выбух быў выкананы прафэсійна. Лукашэнка зьвязаў выбух 11 красавіка з выбухам у 2008 годзе, сказаўшы: «Гэта, магчыма, зьвёны аднаго ланцуга». Ён спытаўся, хто можа атрымаць выгаду ад падрыву стабільнасьці, і дадаў: «Я не выключаю, што гэта быў падарунак з-за мяжы».

Палітыка ў Беларусі заўсёды была непразрыстая. Цяпер праліталася нявінная кроў робіць яе цёмнай і злавеснай.

## НАША ГРАМАДСТВА

# Сенсацыйныя змены ў геапалітычных арыентацыях беларусаў

Апытанне выявіла паргашэнне эканамічнага самаадчування беларусаў. Больш людзей лічаць, што іх дабрабыт знізіўся за апошні час. З нарастаннем эканамічных праблем зніжаецца і давер да Аляксандра Лукашэнкі. Пяць гадоў таму, пасля папярэдніх выбараў, яму давяралі 60% апытаных. На сёння гэтая лічба ўпала ніжэй за палову — да 47%.

Прыкладна 50 на 50 размеркаваліся ацэнкі таго, ці правільна дзейнічалі ўлады 19 снежня.

Палова апытаных лічыць, што ўлады слушна спынілі спробу дзяржаўнага перавароту. Другая палова мяркуе, што адбыўся разгон мірнай акцыі пратэсту.

Але самае галоўнае, што канстатуюць сацыёлагі: няўхільнае ўмацаванне еўрапейскага выбару.

На сёння ўжо больш за 50% апытаных упэўнена выступаюць за еўрапейскі выбар Беларусі. Доля прыхільнікаў саюза з Расіяй упала да 30%.

Пасля выбараў 2006 года на пытанне: «Калі б цяпер у Беларусі праводзіўся рэферэндум з пытаннем, ці ўступаць Беларусі ў Еўрапейскі Саюз, якім быў бы Ваш выбар?» «За» адказалі 31%, а «супраць» — 49%. Сёння гэтыя суадносіны памяняліся да наадварот. 49% супраць 30%.

У 2006 годзе на пытанне: «Калі б сёння праходзіў рэферэндум аб’яднанні Беларусі і Расеі, як бы Вы прагаласавалі?» за аб’яднанне выступалі 42%, а супраць аб’яднання — 38%. Сёння за аб’яднанне з Расіяй засталася абсалютная меншасць: 29%, а 53% супраць.

А вось як дыяметральна змяніліся адказы на пытанне: «Калі б давялося выбіраць паміж аб’яднаннем з Расіяй і ўступленнем у Еўрапейскі Саюз, што б Вы выбралі?» Пяць гадоў таму аб’яднанне з Расіяй выбралі 56%, а ўступленне ў Еўразвяз — 29%. Сёння гэтыя суадносіны складаюць 31 да 50%.

Як высветлілася, толькі 40% рэспандэнтаў лічаць, што на нядаўніх выбарах Аляксандар Лукашэнка набраў столькі галасоў, колькі абвясціла Ярмошына.

А вось 24% беларусаў упэўнены, што цяперашні кіраўнік дзяржавы не набраў большасці галасоў. Яшчэ 35% мяркуюць, што за Лукашэнку прагаласавала большасць, але ўсё ж ён набраў менш галасоў, чым яму налічыў ЦВК. Такім чынам, каля 60% беларусаў думаюць, што ўлада ў той ці іншай ступені сфальшавала вынікі выбараў.

**Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў апублікаваў звесткі апытання, праведзенага ў сакавіку.**

**Мікола Бугай.**

## БЕЛАРУСЬ І СВЕТ

# МІНСК БАІЦЦА МІЖНАРОДНАГА РАССЛЕДАВАННЯ

АФІЦЫЙНЫ МІНСК ВЫСТУПІЎ КАТЭГАРЫЧНА СУПРАЦЬ МІЖНАРОДНАГА РАССЛЕДАВАННЯ ПАДЗЕЙ 19 СНЕЖНЯ 2010 ГОДА ПАД ЭГІДАЙ АБСЕ.

МЗС Беларусі адрэагаваў на ініцыятыву 14 краін АБСЕ правесці міжнароднае расследаванне падзей 19 снежня. Мінск не прызнае «маскоўскі механізм» арганізацыі.

Вялікабрытанія і трынаццаць іншых краін — сябраў Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтва ў Еўропе заклікалі Беларусь да супрацоўніцтва з місіяй міжнародных экспертаў, закліканай сабраць факты для расследавання дзеянняў, звязаных з падаўленнем дэманстрацыі пратэсту пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года.

Гэтая прапанова была зробленая ў рамках схемы АБСЕ, вядомай таксама як «маскоўскі механізм».

МЗС Беларусі праз начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС Беларусі Андрэя Савіных — абвясціла, што

«асобныя краіны Захаду працягваюць палітыку сілавога ціску на Рэспубліку Беларусь, спрабуючы задзейнічаць любыя даступныя сродкі».

А «цяпер яны імкнуцца ўцягнуць у гэты працэс Арганізацыю па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе».

«Група дзяржаваў, маніпулюючы наяўнымі ў дакументах АБСЕ працэдурнымі прабеламі, выступіла з ініцыятывай аб накіраванні ў нашую краіну „місіі дакладчыка“, не маючы для гэтага ніякіх падставаў.

Адвольная, у духу „падвойных стандартаў“, інтэрпрэтацыя дакументаў АБСЕ, дыскрымінацыйныя ініцыятывы і блокавае мысленне супярэчаць каштоўнасцям арганізацыі і руйнуюць яе ролю як ключавога форуму па пытаннях агульнаеўрапейскай бяспекі і супрацоўніцтва.

Беларусь добрасумленна і ў поўным аб’ёме выконвае свае абавязанні ў рамках АБСЕ.

Мы планамерна развіваем нашае ўзаемадзеянне з арганізацыяй па ўсіх напрамках, удзельнічаем ва ўсіх працэсах перамоваў і кансультацыях.

Сёння мы атрымалі відавочнае пацверджанне, што дзейнае старшынства АБСЕ і краіны Захаду не зацікаўленыя ў аб’ектыўным і раўнапраўным дыялогу»,

— так пракаментаваў ініцыятыву 14 краін АБСЕ Андрэй Савіных.

**belaruspartisan.org**

## ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# У БЕЛАРУСІ ДЫСКРЫМІНУЮЦЬ БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ

**Радыё «Свабода»**

**Дзярждэпартамент ЗША абнародаваў штогадовую справаздачу аб стане правоў чалавека ў свеце ў 2010 годзе. Частка справаздачы, прысвечаная Беларусі, змяшчае выразна крытычныя ацэнкі.**

**Прапануем вашай увазе прэамбулу беларускага раздзелу з невялікімі скарачэннямі.**

На працягу года ўлады працягвалі рабіць частыя і сур’ёзныя злоўжыванні ў палітычнай сістэме, у якой дамінуе прэзідэнт і якая не мае стрыманняў і процівагаў.

Улады адмовілі грамадзянам у праве на змену свайго ўраду, маніпулюючы на прэзідэнцкіх выбарах 19 снежня, каб выключыць сур’ёзны выклік дзейнаму прэзідэнту. Праведзенню выбараў не хапала незалежнасці і бесстароннасці; апазіцыйныя кандыдаты апынуліся ў няроўных умовах і мелі абмежаваныя магчымасці ў СМІ; падлік галасоў адзначаўся адсутнасцю транспарэнтнасці.

Сілы бяспекі збівалі затрыманых і пратэстоўцаў, ужывалі празмерную сілу для разгону мірных дэманстрантаў і, паводле некаторых паведамленняў, ужывалі катаванні ў працэсе следства.

Разгон дэманстрацыі пасля выбараў закончыўся арыштамі больш за 700 актывістаў ды крымінальнымі абвінавачаннямі супраць пяці кандыдатаў у прэзідэнты і шматлікіх актывістаў і журналістаў. Паступалі паведамленні аб жорсткім абыходжанні са зняволенымі, умовы ўтрымання ў турмах заставаліся надзвычай цяжкімі. Улады праводзілі самавольныя арышты і затрыманні грамадзянаў за крытыку афіцыйных асобаў, за ўдзел у дэманстрацыях і з іншых палітычных прычынаў.

Беспакаранасць заставалася сур’ёзнай праблемай.

Судовай уладзе не хапала незалежнасці, яна цярпела ад неэфэктыўнасці і палітычнага ўмяшання; вынікі судовых справаў часта былі прадвызначаныя, а шматлікія працэсы праводзіліся за зачыненымі дзвярыма.

Улады працягвалі парушаць правы грамадзянаў на недатыкальнасць прыватнага жыцця, абмяжоўвалі актыўнасць лідэраў апазіцыйнай моладзі прызывам на вайсковую службу.

Улады далей абмяжоўвалі грамадзянскія свабоды, уключаючы свабоду слова, друку, сходаў, асацыяцый, рэлігіі і свабоду перамяшчэння. Улады канфіскоўвалі друкаваныя матэрыялы актывістаў грамадзянскай супольнасці і не дазвалялі незалежным СМІ распаўсюджваць інфармацыю і матэрыялы.

Урад па-ранейшаму перашкаджаў або не дазваляў дзейнічаць рэлігійным групам, якія не належалі да Беларускай праваслаўнай царквы, часам штрафаваў або дэпартаваў іх кіраўнікоў за богаслужэнні.

Карупцыя ўва ўсіх галінах улады працягвала быць праблемай. Улады пераследавалі і штрафавалі няўрадавыя арганізацыі і палітычныя партыі, адмаўлялі многім з іх у рэгістрацыі і потым пагражалі ім крымінальным пераследам за дзейнасць без рэгістрацыі.

Праяўлялася дыскрымінацыя ў дачыненні да асобаў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, цыганоў, этнічных і сэксуальных меншасцяў, асобаў зь ВІЧ / СНІДам, і да тых, хто імкнуўся выкарыстоўваць беларускую мову.

Улады пераследавалі і час ад часу звальнялі чальцоў незалежных прафсаюзаў, сур’ёзна абмяжоўваючы магчымасці працоўных ствараць і ўступаць у незалежныя прафсаюзы.

## ПРАБЛЕМЫ ЭКАНОМІКІ

# «ХАПАЙ, ПАКУЛЬ НЕ ПАДАРАЖЭЛА!»

РАДЫЁ СВАБОДА

АЖЫЯТАЖНЫ ПОПЫТ НА ШЭРАГ ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАНЬНЯ ДЫ НЕКАТОРЫЯ ІНШЫЯ ТАВАРЫ ПРАЦЯГВАЕЦЦА ВА ЎСІХ РЭГІЁНАХ БЕЛАРУСІ. ЛЮДЗІ АСЬЦЕРАГАЮЦЦА РОСТУ ЦЭНАЎ І НАЗАПАШВАЮЦЬ ЦУКАР, КРУПЫ, МУКУ.

«Калі няма даляраў, то разьлічвайся „зайчыкамі“, але па курсе не ніжэйшым, як 4500 за адзін даляр».

Жыхары Віцебску сьпяшаюцца купіць бытавую і кампутарную тэхніку, пакуль яна не падаражэла.

Спадарыня Вольга набыла ў гандлёвым цэнтры «Беларусь» новую друкарку для кампутара:

«Прыйшлі ў „Беларусь“, глядзім, кошт прымальны — 420 тысяч. Мы яе і набылі. Лязэрная друкарка дакладна таньней каштаваць ужо ня будзе. Увогуле людзі ўсе кажуць, што грошы трэба ўкладаць у нейкую нерухомасьць, бо ідзе дэвальвацыя. І цэны на ўсё пачынаюць расьці. Нам вось і кампутар трэба, цяперашні паламаўся, яму ўжо шосты год… Але яго мы ня можам набыць, не хапае грошай!».

Спадарыня Вікторыя спрабуе ўзяць крэдыт на набыцьцё хатняй тэхнікі — таксама чакае, што яна з дня на дзень можа істотна падаражэць: «Справа ў тым, што ў нашых людзей няма столькі наяўных грошай, каб прыйсьці і выкласьці іх адразу за нейкую патрэбную рэч. Але людзі сьпяшаюцца аформіць крэдыты на набыцьцё тэхнікі рознай, пакуль яна па старых коштах. Бо хай цана потым узьляціць удвая, у цябе ўсе аформлена, 10% сплочана, і далей ты будзеш плаціць столькі, колькі на пачатку… Мне нават знаёмыя патэлефанавалі, маўляў, калі ёсьць магчымасьць і патрэба, то хуценька бяжы! Вось тут людзі сапраўды сьпяшаюцца. Тое, што адкладалася на паўгода ці на год, тое купляецца зараз — каб пасьпець набыць яшчэ за меншы кошт».

Але пасьпелі далёка ня ўсе. Шмат хто з прадпрымальнікаў ужо ўзьняў цэны на імпартныя тавары, прычым зыходзячы зь неафіцыйнага курсу даляра. Распавядае спадар Валеры, які працуе на віцебскім аўтарынку: «Прадпрымальнікі ўздымаюць цэны па „чорным“ курсе. Тут, на аўтарынку, ужо прапануюць разьлічвацца далярамі. Калі ў цябе даляраў няма — калі ласка, разьлічвайся „зайчыкамі“, але па курсе не ніжэйшым, як 4500».

Пакупнікі такім падыходам незадаволеныя, але прадпрымальнікі апынуліся ў безвыходным становішчы, кажа спадар Валеры: «Ажыятаж сярод прадпрымальнікаў, бо нельга набыць аніякай валюты! Вунь з рынку стаяць у чарзе, і ня факт, што пашанцуе. А пакупнікі незадаволеныя тым, што цэны папаўзьлі ўгару і растуць ці ня штодня. І кажуць нават, што той тэракт, які здарыўся ў Менску, — гэта не звычайны тэракт, а зьвязаны з палітыкай: каб адцягнуць увагу людзей ад праблемаў, якія зараз узьніклі».

## НУ І НУ!

# ПЬЯНАГА КІРОЎЦУ АСУДЗІЛІ ТОЛЬКІ НА 2,5 ГАДЫ АБМЕЖАВАННЯ ВОЛІ

Гэтая аварыя адбылася ў канцы лістапада на вул. Казінца ў Мінску. П’яны кіроўца Peugeot збіў на нерэгуляваным пешаходным пераходзе мужчыну, які памёр на месцы здарэння.

Завершанае расследаванне, адбыўся суд. Мужчына, які кіраваў аўтамабілем, асуджаны на 2,5 гады абмежавання волі, паведамілі ў аддзеле расследавання ДТЗ ГУУС Мінгарвыканкама.

Кіроўца Peugeot ехаў на сваім аўтамабілі з боку пл. Казінца ў напрамку вул. Кіжаватава. «Было высветлена, што ён рухаўся ў сярэднім шэрагу. Перад ім сталі тармазіць кіроўцы іншых машын. Ён вырашыў апярэдзіць іх па крайняй правай паласе, перабудаваўся і здзейсніў наезд на мужчыну, які заканчваў (а не пачынаў, як паведамлялася першапачаткова) перасякаць праезную частку па нерэгуляваным пешаходным пераходзе», — паведамілі следчыя.

Падчас медыцынскага агляду высветлілася, што ў кіроўцы было амаль 3 праміле алкаголю. Была распачатая крымінальная справа па частцы 2 артыкула 317. Да суду мужчына знаходзіўся ў СІЗА.

— Сваю віну ён адразу прызнаў. Расказаў, што ехаў на магілу памерлага сябра, — удакладнілі следчыя. — Але чаму сеў п’яным за руль, так толкам і не растлумачыў. У аўтамабілі ехалі два пасажыры, што таксама знаходзіліся ў стане алкагольнага ап’янення.

Паводле інфармацыі следчых, кіроўца быў асуджаны на 2,5 гады абмежавання волі з адбываннем пакарання ў папраўчай установе адкрытага тыпу і пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады на працягу пяці гадоў. Таксама на 5 гадоў ён пазбаўлены права кіравання транспартнымі сродкамі.

**auto.onliner.by**

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў
**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742
**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна